РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

22 КРАСАВІКА 2025 г. АЎТОРАК № 78 (30466)

# «БЕРАЖЫЦЕ БЕЛАРУСЬ. ГЭТА МЕСЦА ДЛЯ ЖЫЦЦЯ НАШАГА І НАШЫХ ДЗЯЦЕЙ»

## Да чаго Прэзідэнт заклікаў беларусаў у святы дзень Вялікадня



Фота БелТА.

**Светлае свята Вялікадня Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка па традыцыі сустракае разам з вернікамі. Сёлета — у Свята-Пакроўскім жаночым манастыры, у храме Пакрова Прасвятой Багародзіцы, што ў горадзе Талачын.**

СТАР. 2

ПАРЛАМЕНЦКАЯ ІНІЦЫЯТЫВА З НАГОДЫ 80-ГОДДЗЯ ВЯЛІКАЙ ПЕРАМОГІ 8–9



Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ХАРЧОВАЯ БЯСПЕКА

# ДЛЯ ЎСІХ І ДЛЯ КОЖНАГА

## Не проста накарміць, а прапанаваць збалансаванае харчаванне



Забеспячэнне харчовай бяспекі мае мноства аспектаў і застаецца адным з ключавых прыярытэтаў развіцця краіны, лічыць генеральны дырэктар Навукова-практычнага цэнтра Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па харчаванні Аляксей МЕЛЯШЧЭНЯ.

Ён заўважыў, што калі яшчэ 30 гадоў таму галоўным крытэрыем ступені харчовай бяспекі лічылася проста наяўнасць харчавання ў дастатковай колькасці, то сёння падыходы кардынальна змяніліся. Стаіць задача забяспечваць беларусаў прадукцыяй айчыннай вытворчасці, прычым у розных групах. Цяпер, паводле ацэнак спецыялістаў, у Беларусі выпускаюць не менш за 70 % неабходных тавараў харчовага прызначэння, створана эфектыўная сістэма кантролю якасці гэтай прадукцыі на ўсіх этапах яе вытворчасці і рэалізацыі.

СТАР. 10

ISSN 1990 — 763X

# «БЕРАЖЫЦЕ БЕЛАРУСЬ. ГЭТА МЕСЦА ДЛЯ ЖЫЦЦЯ НАШАГА І НАШЫХ ДЗЯЦЕЙ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Месца гэта ўнікальнае. Гісторыя манастыра бярэ свой пачатак у 1604 годзе, калі ў Талачыне з лёгкай рукі канцлера ВКЛ Льва Сапегі з'явіўся Свята-Пакроўскі храм, які адносіцца да помнікаў архітэктуры віленскага барока. Унікальнасць гэтага помніка ў тым, што ён з'яўляецца адзіным храмам на тэрыторыі Віцебскай вобласці, які захаваўся з пачатку XVII стагоддзя ў сваіх першапачатковых формах. За сваю вялікую гісторыю храм бачыў шмат чаго. У 1769-м царква была пераўтворана ва ўніяцкі храм. Падчас Айчыннай вайны 1812 года французы спалілі Талачын, але манастырскія будынкі не кранулі. У сценах манастыра на начлег заставаўся французскі імператар Напалеон Банапарт. Пасля той ночы храм разрабавалі, вывезлі ў невядомым напрамку ўсе царкоўныя рэліквіі. Пасля гэтага спусташэння манастыр так і не змог аднавіцца. У XIX стагоддзі Свята-Пакроўская царква вярнулася да праваслаўных. Па распараджэнні імператара Мікалая I тут сталі рыхтаваць будучых святароў, бібліятэка манастыра налічвала сотні тамоў. Храм Пакрова Прасвятой Багародзіцы на працягу ўсёй гісторыі існавання дзейнічаў.



Фота БелТА.

## ВЯЛІКДЗЕНЬ ВА ЎСІХ. І ГЭТА СІМВАЛІЧНА

Па традыцыі, у царкве Прэзідэнт запаліў святочную свечку і сказаў некалькі цёплых слоў вернікам. Вітаючы прыхаджан у храме, Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што ні ў адзін іншы дзень людзі так не ўсміхаюцца, як на Вялікдзень. «Колькі ні бываю ў нашых храмах, заўсёды гэты дзень адзначаю як асаблівы. Якія б ні былі цяжкія, складаныя часы, а ў нашай гісторыі яны былі рознымі, мы заўсёды з вялікім натхненнем, вялікім жаданнем чакалі і чакаем гэта светлае і добрае свята — Уваскрэсенне Хрыстова, наш Вялікдзень», — адзначыў ён.

> **Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што гэты дзень стаіць побач з галоўнымі свецкімі святамі — Днём Перамогі, Днём Незалежнасці. «Сёння асаблівы дзень, таму што гэта свята ўсіх нашых хрысціян і тых, хто блізкі да хрысціянства. Так супала, і гэта вельмі сімвалічна для нас, таму што наша краіна — гэта краіна адзінства, справядлівасці і ўзаемаразумення і ўзаемадапамогі», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.**

Прэзідэнт звярнуў увагу, што храму Пакрова Прасвятой Багародзіцы 421 год. «Уяўляеце, колькі ўсяго ён бачыў на сваім жыццёвым шляху і колькі яшчэ ўбачыць, дзякуючы нашым клапатлівым рукам», — сказаў ён. Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што храм — акуратны, дагледжаны. І нагадаў, што парадак павінен быць ва ўсёй краіне ў Год добраўпарадкавання. Тым больш, зрабіў акцэнт Прэзідэнт, год гэты асаблівы яшчэ і тым, што гэта год 80-годдзя Перамогі ў страшнай Вялікай Айчыннай вайне. «Напэўна, як ніякая іншая вобласць нашай велізарнай краіны, Савецкага Саюза, Віцебская вобласць пацярпела ў тыя гады», — сказаў ён. Кіраўнік дзяржавы расказаў, што гэта пацвярджаюць факты, якія адкрываюцца падчас расследавання зверстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны. «Гэта вельмі асаблівы год для Віцебшчыны, для нашай Беларусі. І мы фактычна робім першыя крокі па святкаванні гэтай Вялікай Перамогі ўжо сёння», — адзначыў Прэзідэнт. Ён расказаў, што днямі прыме ўдзел у міжнародным форуме да 80-годдзя Перамогі, што адбудзецца ў Валгаградзе. Затым — святочныя парады ў Маскве і Мінску. Такім чынам будзе аддадзена даніна павагі тым, хто даў нам гэта жыццё.

## ГЭТА ВАЖНА, НАЙПЕРШ, ДЛЯ МОЛАДЗІ

Кіраўнік дзяржавы паведаміў, што сёлета ў Беларусі пачнецца стварэнне цэнтраў традыцыйных рэлігій нашай краіны. Аб гэтым дамаўляліся падчас сустрэчы Прэзідэнта з прадстаўнікамі рэлігійных канфесій у лютым. Найбольш вернікаў адносяцца да праваслаўных. Цэнтрам праваслаўя будзе Свята-Успенскі Жыровіцкі манастыр, рэлігійны і адукацыйны цэнтр. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што зусім нядаўна жамчужына праваслаўя была адноўлена і запрасіў усіх наведаць Жыровічы.

На другім месцы па колькасці вернікаў — каталікі, якія сёння таксама адзначаюць Вялікдзень. «І я хачу, калі віншую праваслаўных, павіншаваць і нашых каталікоў, усіх хрысціян яшчэ раз», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Цэнтрам каталіцызму ў краіне, верагодна, будзе Касцёл Узнясення Найсвяцейшай Дзевы Марыі ў Будславе.

«Таксама мы створым музей гісторыі сусветных рэлігій у Мінску, каб наша моладзь ведала, што такое рэлігія і адкуль карані гэтых рэлігій. І хрысціяне — праваслаўныя і каталікі, і мусульмане, і іудзеі — у гэтым цэнтры любы можа прыйсці і паглядзець, адкуль мы, адкуль наша духоўнасць», — анансаваў новы вельмі важны праект Аляксандр Лукашэнка. Ён адзначыў, што ўжо пабудаваны цэнтр, які сабраў дасягненні беларускага народа, так званы беларускі выставачны цэнтр дасягненняў народнай гаспадаркі. Да 9 мая Мінскі міжнародны выставачны цэнтр будзе поўнасцю адкрыты для наведвання. Асабліва, зрабіў акцэнт Аляксандр Лукашэнка, гэта важна для моладзі: «Каб яны, прыйшоўшы туды, захапіліся і адзін у аднаго спыталі: «Няўжо мы гэта можам вырабляць, няўжо мы гэта сваімі рукамі зрабілі?» Для гэтых мэт будзе пабудаваны і Нацыянальны гістарычны музей. «Каб мы маглі моладзі паказаць, што вось тут карані, у Полацкім, Тураўскім княствах, з гэтых земляў пачыналася стварэнне нашай дзяржаўнасці», — адзначыў Прэзідэнт.

## «ДАВАЙЦЕ БУДЗЕМ КАРЫСТАЦЦА ТЫМ, ШТО Ў НАС ЁСЦЬ, І БУДЗЕМ БЕРАГЧЫ СВАЮ БЕЛАРУСКУЮ ЗЯМЛЮ»

Нягледзячы на свята, у храме гучалі не толькі святочныя тэмы. Аляксандр Лукашэнка зноў звярнуў увагу, што зараз краіна перажывае вельмі няпросты перыяд. «Нам трэба мабілізавацца, згуртавацца і прайсці яго. Турбулентнасць, хаос, нераз-бярыха ў свеце вялізная. Проста мы, улады, стараемся ўберагчы вас ад гэтага хаосу, каб кожны, займаючыся сваёй справай, бачыў вынікі сваёй працы, гадаваў дзяцей, адукацыю стараўся ім даць. Гады вельмі складаныя, вельмі цяжкія, асабліва ва ўмовах санкцый для нашай эканомікі», — сказаў ён. А паколькі эканоміка ў аснове ўсяго, па дарозе ў храм разам са старшынёй Талачынскага райвыканкама кіраўнік дзяржавы абмеркаваў сітуацыю ў раёне. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Талачынскі раён — адзін з найлепшых у Віцебскай вобласці і ў цэлым у краіне па паказчыках. «Але, на жаль, я заўважаю, што тыя, каму мы нямала дапамагалі, не вельмі добра працуюць, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — У царкве не хлусяць, павінен вам прама сказаць, гэты год будзе вельмі сур'ёзны ў плане наведзення парадку ў нашай краіне. Год добраўпарадкавання і наведзення парадку — гэта не проста падмесці вуліцы і высадзіць дрэўцы. Гэта вельмі важна. Кожны на сваім прысядзібным участку, калі гэта на вёсцы, ды і ў гарадах павінен навесці адпаведны парадак, не павінна быць пустых земляў, не павінна быць звалак, занядбаных дамоў і гэтак далей. Вы гэта бачыце. І я таксама гэта бачу. Мы гэты год павінны пражыць годна, ствараючы нармальныя ўмовы для жыцця найперш нашых дзяцей. Не заўсёды і не ўсюды так атрымліваецца, асабліва ў Віцебскай вобласці». Прэзідэнт агучыў інсайдарскую інфармацыю, якая тычыцца найперш кіраўніцтва раёна, але пачуць яе трэба кожнаму: «Рыхтуйцеся да вельмі сур'ёзных кантрольных праверак, каб мы маглі ацаніць, што Віцебшчына зрабіла за гэтыя гады».

«Карыстаючыся выпадкам, знаходзячыся ў гэтым храме Божым, хачу вас папрасіць: рабіце на сваім месцы тое, што павінны рабіць. Гэта нашмат лягчэй, нашмат працсей, чым у паўднёвых нашых суседзяў. Не хацелася б, каб мы да гэтага дайшлі. Таму трэба працаваць і рабіць сваю справу», — звярнуўся Аляксандр Лукашэнка да ўсіх прысутных. Ён падкрэсліў, што ў аснове дзяржаўнай палітыкі заўсёды была і будзе справядлівасць: зарабіў — атрымаў. Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што ў нашай зямлі няма ні нафты, ні газу, якія можна было б выгадна прадаваць. «Мы ўсё сваімі рукамі зарабляем. Напэўна, у гэтым ёсць нейкі сэнс, калі Гасподзь так вырашыў.

> **Таму давайце будзем карыстацца тым, што ў нас ёсць, і будзем берагчы сваю беларускую зямлю. Берагчы для нашых дзяцей. Яна свяшчэнная, яна святая, і другой у нас не будзе, — заклікаў беларускі лідар.**

— Таму я жадаю самага галоўнага — таго, чаго не купіш ні за якія грошы, — міру. Жадаю вам здароўя, вам, вашым дзеткам, каб гэтыя дзеці, вашы дзеці, нашы дзеці, вас ніколі не засмучалі. Каб вы былі такімі светлымі, добрымі, радаснымі, як у гэты святочны дзень. Беражыце Беларусь. Беражыце. Другой такой не будзе. Ды і не трэба другой. Таму што яна самая прыгожая, цудоўная, гэта месца для жыцця нашага і нашых дзяцей».

На памяць аб гэтай цёплай сустрэчы Прэзідэнт падарыў храму Ікону Прасвятой Багародзіцы «Казанская», — адзін з самых вядомых і асабліва шануемых праваслаўных вобразаў Багародзіцы. Настаяцельніца манастыра ігумення Анфіса падзякавала Прэзідэнту за тое, што ён пры сваёй занятасці змог прыехаць у храм. На памяць аб гэтай сустрэчы ў кіраўніка дзяржавы застанецца ікона свяшчэннамучаніка Харлампія.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

*г. Талачын.*

# «МЫ ПАВІННЫ ГЭТА ЎСЁ РАЗВІВАЦЬ ТУТ»

## Развіццё пасёлкаў гарадскога тыпу і дрэваапрацоўку абмяркоўвалі з Прэзідэнтам на прыкладзе Копысі

Стартаваў «рэгіянальны» тыдзень Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі. Як раней анансаваў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Дзмітрый Крутой у эфіры канала «Беларусь 1», на гэтым тыдні беларускі лідар будзе працаваць у рэгіёнах. Пачалася камандзіроўка ў нядзелю ў Талачыне, дзе кіраўнік дзяржавы разам з праваслаўнымі вернікамі адзначыў Вялікдзень. Працягнулася таксама на Віцебшчыне, ужо ў Копысі, што ў Аршанскім раёне.

### «ЧАГО ТУТ НЕ ЖЫЦЬ? МЕСЦА ШЫКОЎНАЕ»

Аляксандр Лукашэнка наведаў дрэваапрацоўчы ўчастак № 2 Аршанскага лясгаса. Але размова тут была больш шырокая, і не толькі пра лясную гаспадарку. Само месца гэтаму спрыяла. Копысь калісьці быў абраны як узор для пасёлкаў гарадскога тыпу, стаўшы прататыпам «вёскі будучыні» з аднайменнай праграмы. І найперш беларускі лідар звярнуў увагу на гэту тэму. «Сёння ў нас кантрольнае мерапрыемства, — заявіў ён. — Па цэнтральнай вуліцы я праехаў — здаецца, нічога. Але вы ўжо ўмееце наводзіць парадак да прыезду Прэзідэнта».

Ва ўзорным пасёлку гарадскога тыпу павінны быць рабочыя месцы. У Копысі дзейнічае дрэваапрацоўчае прадпрыемства Аршанскага лясгаса. Зараз тут працуе 50 чалавек. Вытворчасць важная не толькі з пункту гледжання забеспячэння рабочымі месцамі жыхароў Копысі, але і для галіны. На гэта таксама звярнуў увагу беларускі лідар.

**«Мы павінны ствараць добры прадукт. На поўдзень ад Кіева лесу няма, попыт велізарны, інвестыцыі будуць. Таму вырабляем і прадаём прадукцыю», — адзначыў ён. А гэта, звярнуў увагу Прэзідэнт, робяць людзі, аб якіх трэба клапаціцца. «Для людзей трэба ствараць умовы. Для працы ўмовы нармальныя, я спадзяюся. Але патрэбен дом. Участкі ў нас ёсць, людзі прыехалі. Як толькі мы абмяжуем будаўніцтва жылля ў Мінску і абласных цэнтрах — людзі сюды прыедуць жыць. А чаго тут не жыць? Гэта сапраўды месца шыкоўнае. Усе нашы пасёлкі гарадскога тыпу ў краіне ідэальныя, іх выбіралі для жыцця людзей і будавалі як належыць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.**

У пасёлку гарадскога тыпу павінна быць інфраструктура, павінны быць умовы, заўважыў Прэзідэнт. Напрыклад, у Копысі па даручэнні Аляксандра Лукашэнкі пабудавалі пякарню. Жыхары пасёлка забяспечаны свежым якасным хлебам, ды і ад пакупнікоў з іншых населеных пунктаў адбою няма. Аляксандр Лукашэнка даручыў распаўсюдзіць гэты досвед і ў іншых месцах. Ён звярнуў увагу, што ўсё ўзаемазвязана. «Закранулі праблему — і адразу ўпіраемся ў перспектывы, якія вельмі важныя для нашай краіны. Мы павінны гэта ўсё развіваць тут», — падсумаваў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт паўтарыў тэзіс, які напярэдадні казаў старшыні Талачынскага раёна на Вялікдзень — напярэдадні вельмі сур'ёзны кантроль сітуацыі ў Віцебскім рэгіёне. «Час ставіць на месца — усё плачамся: ах, Віцебская вобласць, яна можа не можа. Мы зараз паглядзім, што яны павінны зрабіць», — заўважыў ён. Аляксандр Лукашэнка паставіў задачу Камітэту дзяржкантролю: дэталёва праверыць сітуацыю ў Віцебскай вобласці — ад фінансаў да кадраў. Пастаўлена таксама задача звярнуць увагу не толькі на пасёлкі гарадскога тыпу, але і на раённыя цэнтры.

«Паглядзім, як пасёлкі гарадскога тыпу пасля прынятага рашэння прыводзяць у парадак», — агучыў мэту мерапрыемства Аляксандр Лукашэнка. Зразумела, праехаць па ўсіх Прэзідэнт не зможа, таму задача для памочнікаў і ўпаўнаважаных пракантраляваць развіццё падобных населішчаў.













### ТУТ НАШЫ ГРОШЫ І НАША ПЕРСПЕКТЫВА

Аб сітуацыі ў лясной галіне кіраўніку дзяржавы далажыў міністр лясной гаспадаркі Аляксандр Кулік. Ён расказаў, што галіна развіваецца дынамічна, экспартныя паказчыкі выконваюцца. У цэлым, па словах міністра, фінансавыя паказчыкі палепшыліся.

**«Вось гэта кажа аб тым, дзе нашы грошы і наша перспектыва. Нават не ў нафтаперапрацоўцы, нам гэтага дабра хапае. Сыравіна, свая сыравіна — гэта трэба развіваць», — канстатаваў Прэзідэнт.**

У мінулым годзе арганізацыі Мінлясгаса паставілі беларускім дзяржаўным і прыватным дрэваапрацоўчым прадпрыемствам 10 млн куб. м драўніны. Кіраўнік спраў Прэзідэнта Юрый Назараў звярнуў увагу, што прадпрыемствам, якія перапрацоўваюць драўніну ў буйных аб'ёмах, неабходна разумець перспектыву. «Тут трэба або з канцэрнам вырашыць пытанні кожнага, або гадавыя таргі на біржы праводзіць, як раней, — адзначыў ён. — Ім трэба разумець перспектыву, гадавы аб'ём кругляка, які ім прапануюць».

«Дык а ў чым справа? Калі мы недаперапрацавалі сыравіну, а хтосьці мае ў ёй патрэбу і хоча бачыць перспектыву, у чым тады праблема? — адказаў на гэта Аляксандр Лукашэнка.

**— Пытанне ж заўсёды ў нас было ў цэнах: біржа — не біржа і гэтак далей. Цяпер мы можам, зыходзячы з існуючай сітуацыі, вызначыцца па цэнаўтварэнні. І аддаць ім па гэтай цане прадукт». Кіраўнік дзяржавы даручыў вырашыць сёлета праблему, каб да 1 студзеня такія перапрацоўшчыкі маглі бачыць перспектыву.**

Асобную ўвагу звярнулі на домакамплекты Міністэрства лясной гаспадаркі. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што на іх ёсць попыт, але дамоў вырабляецца мала. «Трэба задавальняць попыт», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы і паставіў задачу разумна падысці да цэн, каб людзі не адмаўляліся.

Заканчэнне на стар. 4–5 ▶

# «МЫ ПАВІННЫ ГЭТА ЎСЁ

(Заканчэнне.
Пачатак на стар. 3)



**Аляксандр Лукашэнка зрабіў акцэнт на тым, што будаваць жыллё варта там, дзе ў гэтым ёсць рэальная патрэба, дзе ёсць прадпрыемствы. «Трэба спыніць гэту бяздумную будоўлю і спыніць сцягваць людзей у буйныя гарады», — акцэнтаваў Прэзідэнт.**

Аляксандр Кулік падкрэсліў, што зараз міністэрства лясной гаспадаркі ўзводзіць жыллё толькі ў аграгарадках, і папрасіў дазволіць у сістэме лясгаса прадаваць сваім работнікам арэнднае жыллё ва ўласнасць па сканчэнні 10 гадоў арэнды і пры ўмове працы на прадпрыемстве. Прэзідэнт на гэта пагадзіўся. «Добра, толькі за тыя грошы, за якія пабудавалі. Не пытанне, — сказаў ён.

**— Ты працуеш тут, табе арэнднае жыллё пабудавалі. Кіраўнік, які за гэты дом плаціць, запрашае цябе і кажа: «Вось цана». «Добра». Плаціш грошы, працуеш, падпісваеш дамову, не — да пабачэння. Што тут дрэннага? Няхай чалавек купляе дом, а мы за гэтыя грошы яшчэ адзін пабудуем».**

Таксама такі падыход у тым ліку дазволіць замацаваць кадры на прадпрыемствах лясной гаспадаркі.

## «ЛАКАЛІЗАЦЫЮ ТРЭБА ЎМАЦОЎВАЦЬ»

Для выканання заданняў па лесанарыхтоўцы патрабуецца адпаведная тэхніка. У краіне лесанарыхтоўчыя машыны (харвестэры, фарвардэры) выпрабляюць «АМКАДОР» і «МТЗ» (ААТ «Мазырскі машынабудаўнічы завод»), МАЗ. Узоры гэтай тэхнікі паказалі Прэзідэнту. Аляксандр Лукашэнка дэталёва цікавіўся ўзроўнем лакалізацыі ў гэтай тэхніцы, якая дасягае ад 90 да 100 %. Значную колькасць тэхнікі вырабляе «Амкадор». Аляксандр Кулік падкрэсліў, што прадукцыя гэтага прадпрыемства вельмі патрэбная лясной гаспадарцы, фарвардэры вытворчасці «Амкадора» добра зарэкамендавалі сябе. Цяпер прадпрыемства знаходзіцца ў цяжкім стане з-за дзеянняў уласніка, але дзяржава гатова падставіць плячо, як гэта было ўжо не раз. Аляксандр Лукашэнка даручыў разабрацца з сітуацыяй на вытворчасці.

Каля 40 % драўніны нарыхтоўваецца вальшчыкамі лесу з дапамогай бензапіл і ручнога інструмента. Яго таксама прадставілі ўвазе кіраўніка дзяржавы. Сякеру, выробленую на Мінскім трактарным заводзе, Прэзідэнт ацаніў асабіста: «Добрая сякера, ёмкая».

**Аднак Аляксандр Лукашэнка асабіста цікавіўся, чаго не хапае для таго, каб гэта прадукцыя была поўнасцю беларускай вытворчасці. «Трэба паглыбляцца ў гэтым плане. Лакалізацыю ўмацоўваць», — заўважыў Прэзідэнт.**

Карыстаючыся выпадкам, беларускі лідар пацікавіўся ў прадстаўнікоў прадпрыемстваў у цэлым сітуацыяй на вытворчасці, некаторымі асобнымі пытаннямі. Не абышлося і без канкрэтных даручэнняў.

Аляксандру Лукашэнку прадэманстравалі і прадукцыю дрэваапрацоўкі. Напрыклад, попытам карыстаюцца паддоны. Як расказаў міністр лясной гаспадаркі, на іх вытворчасць ідзе драўніна трэцяга-чацвёртага гатунку, якой застаецца вельмі шмат пры вытворчасці дошак. Паддоны робяць і з сухастою, якасць якога не дазваляе вырабляць з яго нешта іншае. «Не дай бог ты пускаеш на паддоны дзелавую драўніну, — папярэдзіў Прэзідэнт. — Гэта ж злачынства».

Праца на дрэваапрацоўчым участку Аршанскага лясгаса не спынілася нават падчас візіту кіраўніка дзяржавы. Ён асабіста азнаёміўся з работай прадпрыемства і прадукцыяй, якую тут вырабляюць. У асартыменце — вагонка з розных парод для лазняў, дошкі для падлогі, вуглы дома, брусы і іншае. Пра асаблівасці працы беларускі лідар цікавіўся непасрэдна ў рабочых. Гаварылі і пра жыццёвыя пытанні. Напрыклад, у аднаго маладога рабочага Аляксандр Лукашэнка спытаў, чаму ён жыве ў Оршы, а не ў Копысі. Малады чалавек адказаў, што, калі была б магчымасць займець тут жыллё, ён бы пераехаў, тое ж самае зрабілі б і яго калегі, якія пакуль прыязджаюць у Копысь толькі на працу. Аляксандр Лукашэнка даручыў кіраўнікам узяць гэта на кантроль — размова пра магчымасць выкупу арэнднага жылля працягнулася.

### Падрабязнасці

#### У Прэзідэнта запланавана серыя камандзіровак па краіне

У графіку Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі на найбліжэйшы тыдзень запланавана серыя камандзіровак па краіне. Такую інфармацыю агучылі ў навінавым эфіры «Беларусь 1», паведамляе БелТА.

— Напярэдадзе серыя камандзіровак. Увесь наступны тыдзень будзе раз'язны. І традыцыйная «чарнобыльская паездка» таксама запланавана ў графіку Першага, — распавялі ў эфіры праекта «Час Першага».

У прыватнасці, адзначылі журналісты, кіраўнік дзяржавы плануе пабываць у Магілёўскай вобласці. Як растлумачыў **кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта Дзмітрый КРУТОЙ,** Аляксандр Лукашэнка мае намер комплексна паглядзець тры рэгіёны.

— Ні для каго не сакрэт, што Магілёўская вобласць пакуль знаходзіцца ў другой часткі турнірнай табліцы па тэме малочнай жывёлагадоўлі. Мы за зіму з губернатарам і прыцягнутымі спецыялістамі склалі праграму развіцця да 2030 года ў разрэзе абсалютна ўсіх гаспадарак, усіх жывёлагадоўчых аб'ектаў і комплексаў. Прэзідэнту пакуль рамачна плануем на месцы далажыць аб контурах гэтай будучай праграмы, якая стане адным з важных элементаў рэгіянальнай праграмы пяцігодкі па Магілёўскай вобласці, — адзначыў Дзмітрый Крутой.






# РАЗВІВАЦЬ ТУТ»

**Таксама, па словах Прэзідэнта, на падобных прадпрыемствах трэба адрадзіць практыку «настаўніцтва»: каб дасведчаныя спецыялісты навучалі маладых калег. У цэлым вытворчасць на прадпрыемстве кіраўнік дзяржавы ацаніў высока. Адна з задач — працаваць над замацаваннем кадраў, каб людзі жылі і працавалі тут, у Копысі.**



На памяць аб гэтай сустрэчы Прэзідэнту падарылі ікону Аляксандра Неўскага, выраблену з дуба — самага моцнага і даўгавечнага дрэва.

## ГЭТА ПАВІННА БЫЦЬ У МАЛЫХ ГАРАДАХ

Маршрут прэзідэнцкай паездкі папоўніўся і нечаканымі пунктамі. Першым стала ААТ «Мілккоп старт», дзе вырабляюць сыры. Гэта вытворчасць была адноўлена па даручэнні Прэзідэнта, а заняўся гэтым прыватны інвестар. Аляксандр Лукашэнка дэталёва азнаёміўся з усімі этапамі вытворчасці і ўбачанае ацаніў крытычна. Адна з найбольшых праблем — адсутнасць ачышчальных збудаванняў. З-за гэтага прадпрыемства перапрацоўвае ўдвая менш сыравіны, чым дазваляюць магутнасці. Цяпер тут перапрацоўваюць каля 60 тон малака за змену, але, працуючы на поўную магутнасць на існуючым абсталяванні, маглі б перапрацоўваць 100 тон. «Трэба разабрацца. Калі ён, інвестар, добра працуе і гатовы тут развівацца — напрамілы бог, няхай будуе ачышчальныя — і наперад. Калі не, значыць, іншы чалавек, іншы інвестар павінен рабіць гэта. Па-гаспадарску разбярыцеся», — паставіў задачу кіраўнік дзяржавы. Ён прайшоў па ўсіх цэхах і памяшканнях прадпрыемства, некаторыя з іх яшчэ знаходзяцца на стадыі добраўпарадкавання, некаторыя выкарыстоўваюцца не па прамым прызначэнні, частка абсталявання не задзейнічана ўвогуле. Убачаным Аляксандр Лукашэнка застаўся незадаволены. Ён раскрытыкаваў кіраўнікоў мясцовай улады, якія не ўдзяляюць гэтай вытворчасці належнай увагі.

**Прэзідэнт паставіў задачу правесці дэталёвую праверку вытворчасці на гэтым прадпрыемстве. «Тут павінны быць санстанцыя і іншыя спецыялісты, якія паглядзяць тэхналогію, што тут правільна, няправільна, захоўванне... Спецыялісты павінны разабрацца», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.**

Незапланаваным быў і прыезд Прэзідэнта на пякарню, якую ўжо згадвалі. Перад адказнымі асобамі пастаўлена задача развіваць яе, у тым ліку і праз павелічэнне вытворчых плошчаў. Па-першае, попыт на прадукцыю вялікі. А па-другое, пашырэнне вытворчасці створыць новыя рабочыя месцы для мясцовых жыхароў. «Каб праз год тут выпякалася столькі хлеба, колькі трэба», — заявіў Прэзідэнт, патлумачыўшы, што гэты досвед можна будзе прымяняць і ў іншых невялікіх населеных пунктах. У прыклад ён прывёў пякарню ў Свіслачы.

**У 2021 годзе, наведваючы з рабочым візітам гэты горад, Прэзідэнт быў здзіўлены смакам і асартыментам прадукцыі. Ён высока ацаніў працу калектыву і падкрэсліў, што невялікае прадпрыемства патрабуе мадэрнізацыі. Цяпер прадукцыю, якая выпускаецца ў сучаснай пякарні, любяць ва ўсёй краіне, а фестываль «Бацькава булка» ўжо стаў мясцовым брэндам.**

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота БелТА.**
*г. п. Копысь.*



АФІЦЫЙНА

## САПРАЎДНЫ ГУМАНІСТ І АБАРОНЦА ІНТАРЭСАЎ ПРОСТАГА ЧАЛАВЕКА

### Памёр Папа Рымскі Францыск

Учора з Ватыкана прыйшла сумная вестка: памёр Папа Рымскі Францыск.

У сувязі са смерцю пантыфіка Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў спачуванне камерленга Рымска-каталіцкай царквы кардыналу Кевіну Фарэлу, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

«У Беларусі з пачуццём глыбокага смутку ўспрынялі навіну аб завяршэнні жыццёвага шляху Яго Свяцейшаства Папы Рымскага Францыска. Шматгадовае служэнне Францыска Хрысту было напоўнена любоўю да паствы, усіх людзей, усяго свету. Як сапраўдны гуманіст і абаронца інтарэсаў простага чалавека пантыфік унёс неацэнны ўклад у справу забеспячэння сацыяльнай роўнасці і справядлівасці. Дзейнасць Папы Рымскага стала сведчаннем глыбокай веры, мудрасці і гуманізму», — гаворыцца ў спачуванні.

Аляксандр Лукашэнка выказаў перакананне, што для ўсіх, хто меў гонар сустрэцца з Яго Свяцейшаствам, ён назаўжды застанецца прыкладам смеласці, годнасці і вернасці хрысціянскім ідэалам.

«З цеплынёй успамінаю афіцыйны візіт у Ватыкан і думкі, якімі мы абменьваліся з Францыскам у шчырых лістах. Удзячны за яго работу па ўмацаванні ўзаемапаважлівых адносін паміж Беларуссю і Апостальскай Сталіцай. Прыміце, Ваша Высокапраасвяшчэнства, мае шчырыя спачуванні і словы падтрымкі ў сувязі з гэтай цяжкай стратай», — адзначыў у пасланні кіраўнік дзяржавы.


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ

**Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП»**
**6 мая 2025 в 14.00**
**проводит повторные торги по продаже следующих объектов:**

| № п/п | Наименование объекта продажи | Начальная цена продажи снижена на 5 %, составляет с учетом НДС 20 %, белорусских рублей | Задаток, белорусских рублей |
|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Станок токарный (б/у) инвентарный, номер 00444309, заводской номер 17690, 1967 года выпуска | 6 270,00 (шесть тысяч двести семьдесят рублей 00 копеек) | 627,00 (шестьсот двадцать семь рублей 00 копеек) |
| Лот № 2 | Токарно-винторезный станок (б/у), Н, металл, инвентарный номер 00440300, заводской номер 20714, 1976 года выпуска | 4 560,00 (четыре тысячи пятьсот шестьдесят рублей 00 копеек) | 456,00 (четыреста пятьдесят шесть рублей 00 копеек) |

**Собственник имущества:** Открытое акционерное общество «Кричевцементношифер», 213493, Республика Беларусь, Могилевская область, Кричевский р-н, Краснобудский с/с, 2, АБК в районе месторождения «Каменка»: тел. +375224120909, тел. для осмотра объектов продажи тел. +375224120914.

**Организатор торгов:** Унитарное предприятие по оказанию услуг «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты», г. Могилев, ул. Циолковского, 1.

Лоты №№ 1, 2 продаются без условий на торгах в форме открытого аукциона с применением метода повышения начальной цены, с шагом 5 (пять) процентов от предыдущей названной аукционистом цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору торгов в сроки, указанные в извещении, необходимые документы и оплатившие задаток. Задаток перечисляется на расчетный счет унитарного предприятия «Могилевское отделение БелТПП»: р/с № BY88ALFA30122641790010270000 в ЗАО «Альфа-Банк», г. Могилев, BIC: ALFABY2X, УНП 700016628.

**Условия регистрации, участия в торгах размещены на интернет сайте организатора по адресу: www.mogilev.cci.by.**

**Срок заключения договора купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем)** – в течение 10 календарных дней после проведения торгов.

Срок оплаты за предметы торгов на условиях заключенного договора купли-продажи.

Торги состоятся **6 мая 2025 г. в 14.00** по адресу: **г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112, Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».**

Срок подачи заявления: с момента выхода публикации настоящего извещения, в рабочие дни – с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 15.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112. **Последний срок подачи заявления – 5 мая 2025 г. до 12.00.**

Регистрация участников торгов 6 мая 2025 г. с 13.30 до 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, к. 112, Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Телефон для справок: (0222) 778032; +375 (44) 735 00 30 – Жилина Ольга Александровна.

Извещение о предыдущих торгах по объектам было размещено в газете «Звязда» от 22.02.2025, 03.04.2025.



**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
информирует о проведении электронных торгов
по продаже имущества, принадлежащего
**УО «Минское государственное областное училище олимпийского резерва»** (Продавец)
на праве оперативного управления.

**Электронные торги состоятся 23.05.2025.**

**Лот № 1:** MERCEDES-BENZ 411 CDI,
кузов (рама) № WDB9046631R527612.
Начальная цена без НДС – 5 900,00 руб.

**Лот № 2:** PEUGEOT BOXER,
кузов (рама) № VF3ZAPMPA17254524.
Начальная цена без НДС – 6 000,00 руб.

**Местонахождение:**
УСБ «Городище», д. Юхновка, Минский район.

Извещение о проведении электронных торгов размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by, Минского областного исполнительного комитета minsk-region.gov.by и на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by).

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57; 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52; torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**
УНП 190055182



**РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**ИНФОРМИРУЕТ О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ**
в информацию о проведении электронных торгов, *опубликованную в газете «Звязда» от 17.04.2025*,
**а именно: электронные торги по Лоту № 8 (CITROEN JUMPY, VF7XS9HUC64195494) проводятся как объявленные впервые 19.05.2025.**
Информация на сайте gostorg.by
и по тел.: 8 (017) 324-70-57; 8 (029) 356-90-03.
УНП 190055182



**РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**ИНФОРМИРУЕТ О ВНЕСЕНИЕ ИЗМЕНЕНИЙ**
в извещение о проведении повторных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Заславльбурвод»**,
назначенных на 30.04.2025 в 11.00,
*опубликованное в газете «Звязда» от 16.04.2025*,
**а именно: начальная цена без НДС – 168,00 руб.**
Информация на сайте gostorg.by
и по тел.: 8 (017) 324-70-57; 8 (029) 356-90-03.
УНП 190055182

PARITETBANK
твой и цифровой

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС**
**31 марта 2025 г.**
ОАО «Паритетбанк»

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 31.03.2025 |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| 1 | АКТИВЫ | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 97 933 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 107 855 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 99 684 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 88 644 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 513 665 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 12 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 61 141 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | 2 905 |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | 26 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | 58 |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 7 533 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | 979 456 |
| 16 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | 91 774 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 685 567 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | 5 221 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 26 418 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | 808 980 |
| 25 | СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 66 055 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 13 023 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 16 998 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 74 400 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 170 476 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 979 456 |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ**
**31 марта 2025 г.**
ОАО «Паритетбанк»

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 31.03.2025 |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 23 713 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 10 804 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 12 909 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 17 543 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 5 506 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 12 037 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | (1) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 17 096 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | - |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | (4 972) |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 1 117 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 21 253 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 547 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 26 330 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 7 196 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 19 134 |

Председатель Правления С.А. Карпов

Главный бухгалтер – директор департамента Е.М. Скриба

Дата подписания: 09 апреля 2025 г.

https://www.paritetbank.by

ОАО «Паритетбанк». УНП 100233809.
Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности от 13 февраля 2024 года № 5.

ГРАМАДСТВА

# АДЗІН ПОДЗВІГ НА ЎСІХ

**Часовая экспазіцыя «Адзінства народаў — залог Вялікай Перамогі» прадстаўлена ў холе Савета Рэспублікі**

Выстаўка, падрыхтаваная супрацоўнікамі Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, сведчыць аб інтэрнацыянальным подзвігу савецкага народа. Фотаздымкі, дакументы і экспанаты з музейнага фонду, якія знаёмяць з асабістымі гісторыямі ўдзельнікаў вайны, падзеямі на франтах, падполлі і ў партызанскай зоне, паказваюць адзінства народаў, дзе кожная нацыя ўнесла істотны ўнёсак у Вялікую Перамогу.



Напрыклад, Брэсцкую крэпасць абаранялі воіны 30 нацыянальнасцяў. А ў складзе 374 тысяч удзельнікаў партызанскага руху на тэрыторыі Беларусі з ворагам змагаліся прадстаўнікі 70 нацыянальнасцяў. Разам з брацкімі народамі беларусы вызвалялі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і сваю зямлю.

## «МЫ ПАВІННЫ КАЗАЦЬ АБ ТЫМ ПОДЗВІГУ, ЯКІ ЗДЗЕЙСНІЎ САВЕЦКІ НАРОД»

**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА** адзначыла, што кожны год Дзень Вялікай Перамогі ў нашай краіне адзначаецца з асаблівымі пачуццямі. «Беларусь першая прыняла ўдар на сябе, і, вядома, гэтыя трагічныя падзеі, якія адбываліся на нашай зямлі, у нашых сэрцах, — канстатавала спікер. — Мы бачым, што сёння адкрываюцца ўсё новыя і новыя факты генацыду беларускага народа. Мы павінны памятаць гісторыю і перадаваць яе з пакалення ў пакаленне. Гэта Перамога была інтэрнацыянальная. Людзі розных нацыянальнасцяў, плячо да пляча, змагаліся за сваю Айчыну. Мы не павінны гэта забываць».

На мінулым тыдні Наталля Качанава прымала ўдзел ва ўрачыстым пасяджэнні Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц СНД, прысвечаным 80-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. «Усе спікеры, мае калегі з розных краін Садружнасці, казалі аб Вялікай Перамозе і тым укладзе, які кожны народ унёс у гэту Перамогу, — удакладніла Старшыня Савета Рэспублікі. — Хтосьці прымаў людзей у эвакуацыю, хтосьці для ўсёй краіны пастаўляў нафту (а гэта паліва для нашай ваеннай тэхнікі), многія ваявалі на палях бітваў — разам, усе. Таму сёння мы павінны шанаваць памяць усіх, хто прымаў удзел у вызваленні нашай роднай Беларусі».

Спікер падкрэсліла, што так заўсёды і было. Беларускія вуліцы носяць імёны герояў розных нацыянальнасцяў, прадстаўнікам іншых народаў, якія змагаліся за Беларусь, на тэрыторыі нашай краіны ўстаноўлены помнікі, ім прысвечаны мемарыяльныя дошкі.

Кажучы аб сімвалізме выстаўкі, Наталля Качанава звярнула ўвагу на тое, што ўдзельнікі Міжпарламенцкай Асамблеі краін СНД як ніхто іншы разумеюць, наколькі важнае адзінства ў адстойванні сваёй Айчыны. «Сёння мы ў розных краінах, але мы разам, — падкрэсліла спікер. — Мы гаворым аб гэтай Вялікай Перамозе, ганарымся сваімі продкамі, якія разам ваявалі, адстойвалі свабоду і незалежнасць нашага тады агульнага дома — Савецкага Саюза. І, вядома, мы будзем усё рабіць для таго, каб гістарычная праўда перадавалася з пакалення ў пакаленне».

Старшыня Савета Рэспублікі акцэнтавала ўвагу на тым, што ў Беларусі робіцца многае для таго, каб моладзь разумела і шанавала ўсё, што было зроблена старэйшымі пакаленнямі для жыцця ў нашай цудоўнай краіне. «Мы не проста захоўваем усё, што было раней зроблена (помнікі, мемарыяльныя знакі, мемарыяльныя дошкі, брацкія магілы, мемарыяльныя комплексы), мы адкрываем новыя факты і робім усё для таго, каб наша моладзь, людзі ўсяго свету ведалі аб тых зверствах, якія былі на нашай зямлі, — канкрэтызавала спікер. — Нізкі паклон Генеральнай пракуратуры, яе супрацоўнікам, якія па крупінках аднаўляюць праўду аб тых падзеях».

Па словах Наталлі Качанавай, сустрэчы з Маладзёжным саветам пры Нацыянальным сходзе, хлопцамі і дзяўчатамі з розных навучальных устаноў, школьнікамі паказваюць, што моладзь цудоўна гэта разумее. «Мы бачым, як яны адносяцца — дакладна гэтак жа трапятліва — да той Вялікай Перамогі і тых страшных падзей, якія былі на нашай зямлі, — удакладніла яна. — Магчыма, камусьці здаецца, што мы шмат кажам аб вайне. Калі мы забудзем, то гісторыя можа паўтарыцца. Каб не дапусціць гэтага, мы павінны пра гэта казаць. Мы павінны казаць аб тым подзвігу, які здзейсніў савецкі народ».

Спікер удакладніла, што варта казаць не толькі аб гераічных удзельніках, хто змагаўся з ворагам на фронце або ў падполлі, але і тых, хто жыў у акупацыі. «У Санкт-Пецярбургу мы ўскладалі кветкі на Піскароўскіх могілках, дзе пахаваны 500 тысяч мірных жыхароў, ваеннаслужачых — усе, хто апынуўся ў гэтым катле, — праінфармавала Старшыня Савета Рэспублікі. — У Беларусі таксама — людзі жылі ў акупацыі, іх знішчалі, здзекаваліся з іх, але яны рабілі ўсё для таго, каб змагацца з фашызмам: ішлі ў падпольныя арганізацыі, стваралі іх, ваявалі ў партызанскіх атрадах. Яны працавалі на нашу агульную Перамогу. Гэта немагчыма забыць. Гэта немагчыма не ацаніць. Таму нізкі паклон усім тым, хто перажыў тыя страшныя падзеі».

## «ПАКУЛЬ Б'ЮЦЦА НАШЫ СЭРЦЫ — ГЕРОІ З НАМІ»

Па словах **дырэктара Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Уладзіміра ВАРАПАЕВА**, выстаўка, якая паказвае інтэрнацыянальную барацьбу супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў на тэрыторыі Беларусі, у рамках рэспубліканскай грамадска-культурнай акцыі «Марафон адзінства» пабывала ў розных рэгіёнах краіны. Дырэктар музея падкрэсліў, што ў нашай рэспубліцы заўсёды шануецца памяць прадстаўнікоў розных нацыянальнасцяў, якія абаранялі Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны. «Уся краіна робіць усё магчымае, каб памяць аб тых падзеях ніколі не згасла, заўсёды была разам з намі, — заўважыў ён. — Пакуль б'юцца нашы сэрцы — героі з намі».

Уладзімір Варапаеў праінфармаваў, што ў музеі вядзецца вялікая работа, накіраваная на азнаямленне наведвальнікаў з імёнамі пераможцаў, дакументамі тых людзей, якія не заўсёды экспануюцца. Асобным блокам прадстаўлены новыя факты, выяўленыя Генеральнай пракуратурай падчас расследавання аб генацыдзе беларускага народа. Па яго словах, добра зарэкамендавала сябе і практыка абмену выстаўкамі з музеямі краін Садружнасці.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота БелТА.**

АКЦЭНТЫ

# ДАСТУПНАЯ МЕДЫЦЫНА — ПРЫЯРЫТЭТ ДЗЯРЖАВЫ

## Намеснік Прэм'ер-міністра Уладзімір КАРАНІК учора правёў нараду па пытаннях аховы здароўя

У цэнтры ўвагі — забеспячэнне якасці і даступнасці медпаслуг і лекаў і своечасовае правядзенне вакцынацыі і дыспансерызацыі.

Уладзімір Каранік нагадаў удзельнікам нарады аб патрабаванні кіраўніка дзяржавы — забяспечыць насельніцтва якаснай і даступнай медыцынскай дапамогай.

— Гэта датычыцца як медыцынскіх паслуг, так і лекавых сродкаў. І прыватная, і дзяржаўная медыцына павінна працаваць паводле адзіных стандартаў, абсалютна празрыста, у адпаведнасці з законам, паколькі гэта — здароўе і бяспека нашых грамадзян.

Што датычыцца лекавага забеспячэння, віцэ-прэм'ер падкрэсліў: у грамадзян павінен быць выбар лекаў рознай цэнавай катэгорыі.

— Лекі айчыннай вытворчасці ўжо даказалі сваю бяспеку, эфектыўнасць і пры гэтым з'яўляюцца даступнымі для абсалютнай большасці насельніцтва. Калі хтосьці жадае (набыць. — **Заўв. аўт.**) прэпараты імпартнай вытворчасці, у іх таксама павінна быць такая магчымасць, але пры гэтым цана павінна быць справядлівай.

Размова таксама ішла і аб мерапрыемствах, якія праводзяцца ў рамках сістэмы аховы здароўя: аб вакцынацыі і дыспансерызацыі.

— Вакцынацыя — найбольш эканамічны, клінічна эфектыўны спосаб прафілактыкі інфекцыйных захворванняў. Дыспансерызацыя і прафілактычная медыцына — гэта найбольш эфектыўны спосаб захавання здароўя, — акцэнтаваў увагу профільны віцэ-прэм'ер.

Ён дадаў, што гэтай работай у Беларусі займаюцца ўжо даўно, але неабходна павышаць яе эфектыўнасць.

— Каб пастаўленыя мэты выконваліся і гэта мела эфект, які выяўляецца ў зніжэнні працэнтаў выхаду на інваліднасць і іншых паказчыкаў клінічнай і эканамічнай эфектыўнасці.



НАПЯРЭДАДНІ

# ДА СУСТРЭЧЫ ГАСЦЕЙ — ГАТОВЫ

## Сяргей ХАМЕНКА ацаніў ход падрыхтоўкі Нацыянальнага дзіцячага тэхнапарка да правядзення форуму «Дзеці Садружнасці»

Ініцыятыва правесці X Міжнародны культурна-адукацыйны форум дзяржаў — удзельніц СНД у нашай краіне належыць Савету Рэспублікі па ўзгадненні з Прэзідэнтам Беларусі. Маштабнае мерапрыемства пройдзе з 7 па 16 чэрвеня. Нацыянальны дзіцячы тэхнапарк стане адной з асноўных лакацый мерапрыемства.




У ходзе ацэнкі гатоўнасці тэхнапарка Сяргей Хаменка разам са спецыялістамі дэталёва агледзеў вучэбна-лабараторны корпус, умовы пражывання і харчавання, азнаёміўся з праграмай, якую тут рыхтуюць для дзяцей.

| **Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона** | Победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившиеся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, в течение **5 (пяти) календарных дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона обязаны возместить продавцу/организатору аукциона затраты на его организацию и проведение на основании счета, выставленного продавцом/организатором аукциона |
| **Условия оплаты** | Оплата задатка производится не позднее даты подачи заявления на участие в аукционе резидентами в белорусских рублях (не резидентами в белорусских рублях или в долларах США по курсу НБ РБ на дату оплаты) на следующие банковские реквизиты: р/с BY79 AKBB 3012 0000 1634 1000 0000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY2X, 220005, г. Минск, пр. Независимости, 56. Получатель – Открытое акционерное общество «Н Холдинг», УНН 101059240, ОКПО 37392696.<br>Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты за объект, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона |
| **Место, дата и время приема заявлений на участие в аукционе** | Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются **по 20 мая 2025 включительно,** в рабочие дни – с 9.00 до 16.55, по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35-1 |
| **Место, дата и время проведения аукциона** | Аукцион состоится **22 мая 2025 года** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, 35-1, зал совещаний ОАО «Н Холдинг» |

Организатор аукциона после опубликования извещения о его проведении вправе в любое время без объяснения причин, но не позднее, чем за 3 календарных дня до даты проведения аукциона, указанной в извещении о проведении аукциона, отказаться от проведения аукциона

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

## ОАО «Н Холдинг» проводит открытый аукцион по продаже недвижимого имущества

**Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ОАО «Н Холдинг» по организации и проведению аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **ЛОТ № 1** | Капитальное строение с инв. № 500/С-49012, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Фабрициуса, 8/9. Площадь – 87,0 кв. м. Наименование – Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Назначение – Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Обременение: аренда.<br>Капитальное строение с инв. № 500/С-48248, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Фабрициуса, 8/12. Площадь – 310,0 кв. м. Наименование – Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Назначение – Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Обременение: аренда.<br>Капитальное строение с инв. № 500/С-48249, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Фабрициуса, 8/8. Площадь – 315,0 кв. м. Наименование – Здание неустановленного назначения. Литер Т2/к. Назначение – Здание неустановленного назначения. Обременение: аренда.<br>Капитальное строение с инв. № 500/С-56445, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Фабрициуса, 8/17. Площадь – 429,7 кв. м. Наименование – насосная станция с артскважиной. Назначение – Сооружение неустановленного назначения.<br>Капитальные строения расположены на земельном участке с кадастровым номером 500000000005005775, площадью 3,2282 га, предоставленном продавцу на праве постоянного пользования (срок действия: не установлен).<br>На земельном участке установлены следующие ограничения: охранная зона линий электропередачи, площадь 0,4265 га; охранная зона сетей и сооружений водоснабжения, площадь 0,4265 га; охранная зона сетей и сооружений канализации, площадь 0,4265 га; охранная зона сетей и сооружений теплоснабжения, площадь 0,0490 га; охранная зона сетей и сооружений газоснабжения, площадь 0,4265 га | | | | |
| **Начальная цена (стоимость) (в т. ч. НДС 20 %), BYN** | 1 063 209,00 | **Задаток, BYN** | 106 320,90 | **Шаг аукциона** | 5 % |
| **ЛОТ № 2** | Капитальное строение с инв. № 500/С-26535, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Фабрициуса, 8/10. Площадь – 595,0 кв. м. Наименование – 2/К здание очистных сооружений. Назначение – Здание многофункционального. Обременение: аренда.<br>Капитальное строение с инв. № 500/С-49015, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Фабрициуса, 8/11. Площадь – 339,9 кв. м. Наименование – Литер Х 1/мет. Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Назначение – Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Обременение: аренда.<br>Капитальные строения расположены на земельном участке с кадастровым номером 500000000005005775, площадью 3,2282 га, предоставленном продавцу на праве постоянного пользования (срок действия: не установлен).<br>На земельном участке установлены следующие ограничения: охранная зона линий электропередачи, площадь 0,4265 га; охранная зона сетей и сооружений водоснабжения, площадь 0,4265 га; охранная зона сетей и сооружений канализации, площадь 0,4265 га; охранная зона сетей и сооружений теплоснабжения, площадь 0,0490 га; охранная зона сетей и сооружений газоснабжения, площадь 0,4265 га | | | | |
| **Начальная цена (стоимость) (в т. ч. НДС 20 %), BYN** | 969 224,10 | **Задаток, BYN** | 96 922,41 | **Шаг аукциона** | 5 % |

| | |
|---|---|
| **Сведения о продавце/ организаторе аукциона, его местонахождение и контактные телефоны** | ОАО «Н Холдинг», 220029, г. Минск, пр. Машерова, 11, пом. 1.<br>тел.: 8 017 284 94 32,8 029 754 63 46, Мария;<br>e-mail: arenda@h-holding.by |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | Договор купли-продажи должен быть заключен в течение **10 (десяти) календарных дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона |
| **Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона** | Победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившиеся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, в течение **5 (пяти) календарных дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона обязаны возместить продавцу/организатору аукциона затраты на его организацию и проведение на основании счета, выставленного продавцом/организатором аукциона |
| **Условия оплаты** | Оплата задатка производится не позднее даты подачи заявления на участие в аукционе резидентами в белорусских рублях (не резидентами в белорусских рублях или в долларах США по курсу НБ РБ на дату оплаты) на следующие банковские реквизиты: р/с BY79 AKBB 3012 0000 1634 1000 0000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY2X, 220005, г. Минск, пр. Независимости, 56. Получатель – Открытое акционерное общество «Н Холдинг», УНН 101059240, ОКПО 37392696.<br>Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты за объект, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона |
| **Место, дата и время приема заявлений на участие в аукционе** | Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются **по 22 мая 2025 включительно,** в рабочие дни – с 9.00 до 16.55, по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35-1 |
| **Место, дата и время проведения аукциона** | Аукцион состоится **26 мая 2025 года** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, 35-1, зал совещаний ОАО «Н Холдинг» |

Организатор аукциона после опубликования извещения о его проведении вправе в любое время без объяснения причин, но не позднее, чем за 3 календарных дня до даты проведения аукциона, указанной в извещении о проведении аукциона, отказаться от проведения аукциона

## Извещение о проведении **7 мая 2025 года** повторных торгов на право размещения средств рекламы в лифтах многоквартирных жилых домов, расположенных во Фрунзенском районе г. Минска

| Место размещения средства рекламы (согласно поадресной инвентаризации лифтов*) | Вид средства рекламы (согласно техническому заданию) | Размер средств рекламы | Площадь рекламного поля, кв. м | Количество средств рекламы, единиц | Начальная цена предмета торгов (с учетом НДС)/ сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| Лифтовые кабины жилых домов, расположенные во Фрунзенском районе г. Минска | Антивандальный стенд (лифтборд) – 3 157 шт. | 594*420 мм (А2) – в лифтах грузоподъемностью до 400 кг | 0,25 | 2987 | 40 930,80 |
| | | 630*594 мм (6 А4) – в лифтах грузоподъемностью от 400 до 630 кг | 0,37 | 151 | |
| | | 841*594 мм (А1) – в лифтах грузоподъемностью 630 кг и выше | 0,50 | 19 | |

**Срок действия договора – 1 год** со дня подписания его сторонами без права продления.

**Уполномоченное лицо по управлению общим имуществом совместного домовладения** – коммунальное унитарное предприятие «Жилищное коммунальное хозяйство № 2 Фрунзенского района г. Минска», г. Минск, ул. Матусевича, дом 42, пом. 1, тел. (017) 215-07-46.

**Организатор торгов** – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10, тел. (017) 360-42-22.

**Форма проведения торгов** – аукцион на повышение начальной цены.

Торги проводятся в соответствии со ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения торгов на право размещения средств рекламы в лифтах многоквартирных жилых домов, утвержденным организатором торгов.

Аукционные торги проводятся **7 мая 2025 г. в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Карла Маркса, 39, зал аукционов (каб. 7).

Документы на участие в торгах принимаются с 22.04.2025 **по 05.05.2025** включительно, в рабочие дни – с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 6.

Документы, поданные по истечении указанного срока, не рассматриваются. Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представленных для участия в торгах, несут лица, их подавшие.

**Порядок оформления участия в торгах:** к участию в аукционных торгах допускаются лица, прошедшие заключительную регистрацию, которые в срок, установленный для приема документов на участие в аукционных торгах, внесли задаток и заключили с организатором торгов соглашение установленной формы о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения торгов по соответствующему их предмету (далее – соглашение), а также представили организатору торгов следующие документы:

– заявление на участие в торгах;

– копию платежного документа о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет организатора торгов;

– копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, желающих принять участие в торгах.

Сумма задатка (сумма задатка соответствует начальной цене предмета торгов) должна быть внесена по соответствующему предмету торгов не позднее окончания срока и времени, установленных для приема документов, на расчетный счет организатора торгов BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, (назначение платежа – задаток для участия в торгах на право размещения средств рекламы, назначенных на 07.05.2025).

Участнику, не ставшему победителем торгов (лицом, приравненным к победителю торгов), внесенный задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

При подаче организатору торгов документов для участия в торгах и заключении соглашения представляются:

физическим лицом, в том числе индивидуальным предпринимателем, – документ, удостоверяющий личность;

представителем физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица – оригинал документа, подтверждающий его полномочия, и документ, удостоверяющий личность.

Лицу, допущенному к участию в аукционных торгах, организатор торгов выдает билет участника торгов, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. Перед началом торгов организатор торгов проводит заключительную регистрацию лиц, допущенных к участию в торгах. Заключительная регистрация представляет собой замену билетов участников торгов на аукционные номера, под которыми участники торгов будут участвовать в торгах. После проведения торгов участники обязаны вернуть эти номера организатору торгов.

**Порядок определения победителя торгов:** торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Не допускается продажа предмета торгов по начальной цене. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона, который определяется аукционистом в пределах от 5 до 15 процентов от предыдущей названной аукционистом цены. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов. Если заявление на участие в торгах подано только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику, при его согласии, по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, а такой участник признается лицом, приравненным к победителю торгов.

**Иные условия торгов:**

Победитель торгов (единственный участник торгов) обязан:

- **в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов** оплатить вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 5 процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов;

- **в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов** перечислить на расчетный счет уполномоченного лица по управлению общим имуществом совместного домовладения сумму средств, за которую продан предмет торгов за вычетом внесенной суммы задатка (цена продажи предмета торгов – стоимость услуг уполномоченного лица по управлению общим имуществом совместного домовладения по размещению рекламы в лифтах многоквартирных жилых домов, определенная по итогам торгов и уплачиваемая ежемесячно в соответствии с договором на оказание услуг по размещению рекламы);

- **в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов** заключить договор на оказание услуг по размещению рекламы с уполномоченным лицом по управлению общим имуществом совместного домовладения (при условии внесения платы за предмет торгов и перечисления суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов).

Размер штрафа, уплачиваемого участником торгов и (или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет 99 (девяносто девять) базовых величин на дату проведения торгов.

**Телефон для справок:** (017) 360-42-22 – отдел аукционов (по вопросам организации и проведения торгов).

Извещение о проведении торгов размещено на сайтах: организатора торгов – **www.mgcn.by** (раздел «АУКЦИОНЫ/Рекламные конструкции»); Минского городского исполнительного комитета – **www.minsk.gov.by** (раздел «Объявления – Аукционы»).

Дополнительная информация и поадресная инвентаризация лифтов* размещены на сайте организатора торгов – www.mgcn.by (раздел АУКЦИОНЫ/Рекламные конструкции/Файлы).

# УРОКІ АТРАХОВІЧАЎ

## Прайсці праз выпрабаванне вайной і жыць у добрай згодзе



Загадчык кафедры дызайну моды факультэта сацыякультурных камунікацый БДУ, дацэнт, кандыдат мастацтвазнаўства Алена АТРАХОВІЧ сваёй галоўнай справай лічыць выкладанне. Але яна піша не толькі навучальныя дапаможнікі для студэнтаў. Алена Ігараўна — аўтар твораў пра членаў сваёй сям'і: знакамітага дзеда, народнага пісьменніка БССР Кандрата Крапіву і дзядзьку Барыса, які загінуў на вайне.

### ПОБАЧ З КЛАСІКАМ

— Калі ў дзяцінстве ў мяне пыталіся пра сям'ю, заўсёды з гонарам адказвала: «Мой дзед — пісьменнік!» — успамінае Алена Ігараўна. — Назаўжды запомніўся стол дзеда, на якім стаяў чарнільны прыбор, ляжала мармуровае прэс-пап'е — ён здаваўся мне вялізным, незвычайным. У Кандрата Крапівы быў свой кабінет, выдатная бібліятэка, якую ён збіраў на працягу жыцця і надзвычай шанаваў. Да кніг ставіўся вельмі беражліва і трапятліва. Нядбайнасць, закладзеныя старонкі выклікалі ў яго абурэнне. Калі дзядуля працаваў, ніхто не шумеў, не перашкаджаў яму. Дома ўвогуле было не прынята гучна размаўляць, павышаць голас, крычаць з пакоя ў пакой.

***— Якім Кандрат Крапіва запомніўся вам у штодзённым жыцці?***

— Цікавым, глыбокім, шматгранным. У коле сям'і, калі ўсе збіраліся за агульным сталом, дзед расслабляўся, жартаваў. У паўсядзённым жыцці яго адрознівалі строгасць і дысцыплінаванасць. Часта паўтараў мне: «Не адхіляйся ад галоўнага», — вучыў выдзяляць прыярытэты і засяроджвацца на іх. Дзед прытрымліваўся рэжыму, вельмі шанаваў час, стараўся кожнай гадзінай распарадзіцца прадуктыўна. Раніцай ішоў у Акадэмію навук. Вярнуўшыся дадому, крыху адпачываў і садзіўся за стол: пісаў навуковыя артыкулы, п'есы, байкі, часам да глыбокай ночы. Казаў: калі горад заціхае, сям'я спіць, яму вельмі плённа працуецца. Дзед лічыў: «Натхнення чакаць не трэба, яно можа і не прыйсці». Па маіх назіраннях, ён увесь час знаходзіўся ў засяроджаным разважанні, спачатку абдумваючы свае творы, а потым ужо браўся за ручку.

***— З кім з пісьменнікаў Кандрат Крапіва асабліва сябраваў?***

— Вялікім і шчырым яго сябрам быў Міхась Лынькоў. Пазнаёміліся яны яшчэ да вайны, але зблізіліся крыху пазней. Жонку Лынькова Ханну і яго сына Марыка ў верасні 1941-га расстралялі немцы, гэта стала страшным ударам для яго. Пасля вайны Міхась Ціханавіч не адразу знайшоў сабе спадарожніцу жыцця. У нядзелю звычайна прыходзіў у госці да дзеда, і мая клапатлівая, гаспадарлівая бабуля Алена частавала яго мачанкай з блінамі. Мужчыны елі, размаўлялі пра жыццё і літаратуру. Сябраваў дзед і з Пятром Глебкам. Іх дачы ў Ждановічах размяшчаліся па суседстве. Летам яны ўвесь час заходзілі адзін да аднаго ў госці, абменьваліся парадамі, як павысіць ураджайнасць на градках, гулялі ў шахматы, гутарылі.

### ВЫПРАБАВАННЕ ВАЙНОЙ

***— Што распавядаў Кандрат Крапіва аб войнах, у якіх яму прыйшлося браць удзел?***

— Як многія ўдзельнікі войнаў, ён не любіў гаварыць на гэтыя тэмы. Лічыў: вайна — найцяжэйшае, на грані чалавечых магчымасцяў, выпрабаванне. Дзед са зброяй у руках прайшоў Першую сусветную вайну, фінскую, удзельнічаў у вызваленні Заходняй Беларусі. У час Вялікай Айчыннай быў ваенным карэспандэнтам і па спецыяльным пасведчанні меў права наведваць усе франты. Распавядаў, што здараліся небяспечныя сітуацыі, даводзілася прарывацца з акружэння. Запомніліся яго словы аб тым, што падчас баявых дзеянняў дзіўным чынам знікае страх. Згадваў некалькі момантаў, калі мог загінуць, але нейкім цудам заставаўся жывым, і пасля гэтага з'яўлялася адчуванне, быццам ён — загавораны. Думаю, дзед не скідваў з рахунку момант шанцавання, лёсу. Ён часта жадаў людзям «шчаслівай долі».

***— Што падахвоціла вас напісаць радыёп'есу «Пісьмы, вернутыя з небыцця»?***

— Калі працавала над успамінамі для кнігі «Кандрат Крапіва. Шлях да неўміручасці», вывучала ў НАН Беларусі архівы, пазнаёмілася з франтавымі лістамі, дасланымі дзядулі яго сынам Барысам. На момант пачатку вайны Барыс Атраховіч служыў па прызыве ў войску, на савецка-польскай мяжы. Ён адразу апынуўся ў ваенным пекле. Пазней удзельнічаў у кровапралітных баях за Кіеў, Харкаў. Загінуў у 1942-м у Сталінградскай бітве падчас аперацыі «Малы Сатурн». У пачатку Вялікай Айчыннай дзед нічога не ведаў пра лёс старэйшага сына. А калі яны знайшлі адзін аднаго, завязалася перапіска. Дзед беражліва захоўваў 44 лісты Барыса. У канцы жыцця, калі перабіраў архіў, Крапіва вырашыў аддаць іх у Акадэмію навук на захаванне. Простыя і вельмі кранальныя, яны мяне вельмі ўразілі. На радыё ў рэдакцыі літаратурна-мастацкіх праграм мне параілі напісаць сцэнарый для радыёпастаноўкі. Цэлы год вывучала хроніку і спецыяльную літаратуру аб Вялікай Айчыннай вайне. Па лістах аднавіла баявы шлях Барыса Атраховіча і апошнія дні яго жыцця. Так атрымалася п'еса «Пісьмы, вернутыя з небыцця». Лёс майго дзядзькі Барыса адлюстроўвае лёс яго пакалення. З кожных 10 мужчын 1922 года нараджэння з вайны вярнуўся толькі адзін. Перарваныя біяграфіі, нерэалізаваныя планы, мары і жаданні. Гэта трагедыя, пра якую нельга забываць.





### ЖЫЦЬ У ДОБРАЙ ЗГОДЗЕ

***— Кандрат Крапіва пражыў са сваёй жонкай Аленай Канстанцінаўнай 45 гадоў, вашы бацькі Зоя Мікалаеўна і Ігар Кандрацьевіч — 40 гадоў, столькі ж вы з мужам Анатолем. Можа, ёсць нейкі сакрэт такіх доўгіх трывалых сямейных саюзаў?***

— Своеасаблівы «рэкорд» належыць маім бабулі і дзядулі па мамінай лініі — іх шлюб доўжыўся 68 гадоў! Жыць доўга і дружна, «у добрай згодзе», як казаў дзед, — гэта, безумоўна, не толькі пытанне шанцавання. Бацька Кандрата Крапівы быў супраць таго, каб сын ажаніўся з Аленай Канстанцінаўнай Махнач — з сям'і пагарэльцаў, беспасажніцай. Але дзед настаяў на сваім. Яго адрознівала моцнае пачуццё сям'і. Ён лічыў, што мужчына павінен даваць жонцы, дзецям, унукам пачуццё абароненасці. Усе яго паводзіны ўплывалі на атмасферу дома. Не прыгадаю, каб хоць раз дзед ужыў лаянку, а прайшоў жа праз столькі войнаў, і, зразумела, яму даводзілася ў экстрэмальных умовах чуць не толькі літаратурную гаворку. Усе шлюбы ў нашай сям'і мацавала духоўная роднасць. Спадарожніца Крапівы, мая бабуля Алена, адрознівалася дамавітасцю, гаспадарлівасцю, але займалася не толькі бытам. Яна дапамагала мужу передрукоўваць яго рукапісы. Мае маці і бацька пазнаёміліся яшчэ школьнікамі — пасля вайны абодва жылі на Маладзечанскай вуліцы: разам раслі, сябравалі, а потым ажаніліся. Я сустрэла будучага мужа, Анатоля Александровіча, у 17 гадоў, падчас уступных іспытаў у Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут. Гэта было каханне з першага погляду. Рана ўступіўшы ў шлюб, мы фарміраваліся як асобы ва ўнісон. Гэта вельмі зблізіла, мы адчувалі сябе роднымі па духу людзьмі.

**Вольга ПАКЛОНСКАЯ.**
**Фота з сямейнага архіва Алены АТРАХОВІЧ.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ

**Организатор электронных торгов:** Руденский сельский исполнительный комитет, 222850, Минская область, Пуховичский район, Руденский сельисполком, г. п. Руденск, ул. Ленинская, 17, тел.: +375295060239, +375171390275.

**Оператор электронной торговой площадки:** ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа». **Торги проводятся 27.05.2025** на электронной торговой площадке «БУТБ-Имущество», **www.et.butb.by.** **Время торгов** устанавливается инструментарием площадки в автоматическом режиме.

| № лота | Местонахождение земельного участка; кадастровый номер | Площадь земельного участка, га | Инженерная инфраструктура | Начальная цена лота, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. | Сумма затрат на организацию и проведение торгов, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **г.п. Руденск, ул. Карла Маркса, 65; 624485790501000185** | 0,1270 | Участок свободен от застройки. Имеется техническая возможность подключения к сети ВЛ-0,4кВ, разрешенная к использованию мощность 15кВт; в районе участка проходят сети газоснабжения | 21 297,90 | 4 259,58 | 2 920,13 + публикация в СМИ |

**Продавец:** *Руденский сельский исполнительный комитет 222850, Минская область, Пуховичский район, г. п. Руденск, ул. Ленинская, 17; Председатель Криворукова Наталья Анатольевна, тел.: +375295060239, +375171390275*

**Окончание приема заявлений на участие в торгах с прилагаемыми к ним документами** – 22.05.2025, до 15.00.

**Задаток** для участия в торгах перечисляется на текущий (расчетный) банковский счет № BY60AKBB30120000066940000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код AKBBBY2X, УНП 190542056, получатель платежа – ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа».

**Срок внесения задатка** – не позднее даты и времени окончания приема заявлений на участие в торгах. **Назначение платежа**: внесение суммы задатка для участия в электронных торгах.

Лицо, желающее принять участие в электронных торгах в отношении нескольких предметов электронных торгов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из этих предметов. Оплата стоимости предметов торгов осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время либо с участием представителя организатора в рабочее время (понедельник–пятница, 8.00–13.00, 14.00–17.00).

Электронные торги проводятся в порядке, установленном Положением «О порядке проведения электронных торгов по продаже государственного имущества, включая земельные участки, права заключения договора аренды государственного имущества, в том числе земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 608 и Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа» от 29.12.2015 № 143.

Затраты на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельным участкам для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов **подлежат возмещению** в порядке, предусмотренном в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 7 февраля 2006 г. № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры».

СПОРТ-ТАЙМ

# ДЗЯКУЙ, «ЗУБРЫ»

## «Дынама-Мінск» правёў свой найлепшы сезон у КХЛ

Усё добрае рана ці позна заканчваецца. Вось і чарговы сезон хакейнага клуба «Дынама-Мінск» у Кантынентальнай хакейнай лізе падышоў да завяршэння. Як звычайна напрыканцы думаецца, што ўсё можна было зрабіць лепш і больш. І тут варта адразу акрэсліць, што гэта найлепшы сезон «зуброў» у КХЛ. Ніколі раней балельшчыкі не хадзілі на матчы ў сярэдзіне красавіка. А сёлета дынамаўцы падарылі ім такую магчымасць, калі прайшлі ў другі раўнд плэй-оф Кантынентальнай хакейнай лігі. Упершыню ў гісторыі!



Выхад, прычым заўчасны, клуба ў стадыю плэй-оф нечаканасцю не стаў. Апошнія пяць сезонаў мінскія хакеісты стабільна даходзілі да гэтай стадыі. І гэтак жа стабільна не праходзілі далей першага раўнда. Тройчы іх не пускала туды СКА. А ў сезоне 2023/2024 мінскія дынамаўцы ў першым раўндзе спаборнічалі з маскоўскімі аднаклубнікамі і прайгралі ў 1/8 фіналу. У гэтым сезоне сапернікам «Дынама-Мінск» у першым раўндзе плэй-оф стаў маскоўскі ЦСКА. Упершыню ў гісторыю выступленне ў плэй-оф «зубры» пачалі дома. На роднай арэне яны ўпэўнена выйгралі дзве гульні. У Маскве дзве гульні прайгралі. Пасля дома паказалі неверагодныя 7:0, ведалі 6 тады аматары і хакеісты, што іх чакае наперадзе. І замацавалі поспех перамогай у Маскве.

З вынікам у серыі 4:2 «зубры» прарваліся ў другі раўнд плэй-оф. А там іх чакаў чакаў чалябінскі «Трактар» — бронзавы прызёр КХЛ сезона 2023/2024, лідар Усходняй канферэнцыі. Каманда загадзя мацнейшая, але і дынамаўцы «хлопчыкамі для біцця» ў гэтай серыі не былі. Зусім не былі, хоць і вынік у серыі 4:1. У кожным матчы хакеісты «Дынама-Мінск» змагаліся да апошняга, біліся па максімуме сіл і магчымасцяў. Праўда, не без памылак, але ж не памыляецца той, хто нічога не робіць. А іх адзіная перамога ў гэтым супрацьстаянні, здабытая на лёдзе «Мінск-арэны» з вынікам 8:0, — найбуйнейшая перамога ва ўсёй гісторыі каманды. І гэта адзін з рэкордаў хакеістаў «Дынама-Мінск» у гэтым сезоне. І за гэта спартсменам і трэнерам варта сказаць вялікі дзякуй.

«Лічу, што серыя ў цэлым выйшла роўнай. Два першыя матчы ў гасцях мы выдатна адыгралі, але не ўтрымалі перамогі. У чацвёртай гульні дома таксама не дацярпелі. У гэтым сезоне мы зрабілі вялікі крок наперад, падрасла добрая моладзь. На жаль, у плэй-оф крыху не хапіла вопыту», — адзначыў капітан каманды Андрэй Стась пасля апошняй гульні з «Трактарам».

«Давайце будзем аб'ектыўныя: «Трактар» — вельмі майстарская каманда, якую многія эксперты з самага пачатку называлі галоўным прэтэндэнтам на Кубак Гагарына ў гэтым сезоне. Я асабліва рады за нашу моладзь — Віталь Пінчук, Вадзім Мароз, Ягор Борыкаў узялі на сябе ролю лідараў і паказалі выдатны прагрэс. Гэты сезон атрымаўся дастойным не толькі для «Дынама», але і для ўсяго беларускага хакея», — заўважыў старшыня Федэрацыі хакея Беларусі Аляксандр Багдановіч.

У гэтым сезоне «зубры» паказалі свой патэнцыял. А ён больш, чым можа падацца на першы погляд, бо нават у тых матчах, якія скончыліся паражэннем, яны выглядалі дастойна. Проста, як заўважыў галоўны трэнер Дзмітрый Квартальнаў, ёсць моманты, якія сапернік рэалізуе лепш.

«Гэты сезон паказаў нам сілу мінскага «Дынама», сілу шчырай падтрымкі балельшчыкаў, сілу хатняй арэны, зладжанай працы каманды, мудрасці трэнерскага штаба. А самае важнае — гэты сезон паказаў нам, што мы на правільным шляху, і далей — больш. Разам мы паставілі не адзін рэкорд: гульні, ачкі, аншлагі. Зайшлі так далёка, дасягнулі пастаўленай мэты і рэалізавалі мару даўжынёй у 17 сезонаў. Апетыт прыйшоў падчас ежы, і мы былі гатовыя здзейсніць прарыў. Годна гулялі супраць лідара Усходняй канферэнцыі. І, нягледзячы ні на што, напісалі самую слаўную старонку ў гісторыю нашага клуба», — падсумаваў генеральны дырэктар клуба Арцём Каркоцкі.

Гэты сезон яшчэ будуць абмяркоўваць і аналізаваць, рабіць высновы і выпраўляць памылкі. Яго будуць памятаць вельмі доўга. А пакуль хочацца проста падзякаваць камандзе за эмоцыі, якія яны падарылі. За тое, што кожны матч на трыбунах «Мінск-арэны» больш за 15 тысяч чалавек і яшчэ сотні тысяч аб'ядноўваліся ў адным звяне каля тэлевізараў. Такое магчыма толькі ў спорце. Дзякуй за гэта, «зубры».

**Валерыя СЦЯЦКО.**

**Фота ХК «Дынама-Мінск».**

НАДВОР'Е

# ТЭМПЕРАТУРНЫЯ АРЭЛІ

## Сёння прыпячэ да 29, а пасля пахаладае

Сёлета вясной нас кідае то ў спякоту, то ў холад. Пасля нечаканых замаразкаў у пачатку красавіка, у сярэдзіне месяца да нас зазірнуў амаль што чэрвень.

Як паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды, ужо на гэтым тыдні чакаецца паніжэнне тэмпературы.

Сёння надвор'е ў Беларусі будзе вызначаць цёплая няўстойлівая паветраная маса. Пераменная воблачнасць. Ноччу пераважна без ападкаў, днём месцамі па краіне чакаюцца невялікія кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Ноччу і раніцай у асобных слабы, днём паўднёвы ўмераны, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ўначы ад плюс 8 да 14 °C, месцамі плюс 4—7 °C, максімальная днём будзе даходзіць да 23—29 °C.

У сераду з тэрыторыі Польшчы чакаецца зрушэнне франтальнага падзелу. Воблачна з праясненнямі. На большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, месцамі з навальніцамі. Ноччу і раніцай у асобных раёнах слабы туман. Вецер паўднёвы з пераходам на паўночны ўмераны, пры навальніцах — парывісты. Тэмпература паветра ўначы ўсталюецца на ўзроўні плюс 7—14 °C, а максімальная днём — ад плюс 16 °C па паўночным захадзе, да 28 °C па паўднёвым усходзе краіны.

У чацвер надвор'е будуць вызначаць атмасферны фронт і няўстойлівая паветраная маса. Воблачна з праясненнямі. Месцамі па краіне чакаюцца кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Тэмпература паветра ўначы плюс 5—11 °C, па паўднёвым усходзе Беларусі да 14 °C. Максімальная тэмпература днём плюс 15—22 °C, на поўдні краіны паветра прагрэецца да 25 °C. Праўда, далей будзе яшчэ халадней.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Надвор'е на заўтра

| Горад | Ноччу | Днём |
|---|---|---|
| МІНСК 763 мм рт.сл. | +13..+18°C | +18..+20°C |
| ВІЦЕБСК 761 мм рт.сл. | +14..+18°C | +19..+20°C |
| МАГІЛЁЎ 760 мм рт.сл. | +14..+16°C | +21..+24°C |
| ГОМЕЛЬ 759 мм рт.сл. | +12..+15°C | +26..+27°C |
| ГРОДНА 762 мм рт.сл. | +11..+13°C | +17..+19°C |
| БРЭСТ 762 мм рт.сл. | +12..+14°C | +20..+22°C |

Паводле даных Белгідрамета

### ...у суседзяў

МАСКВА +26..+28°C

С.-ПЕЦЯРБУРГ +9..+11°C

### Месяц

*Апошняя чвэрць 21.04—26.04. Месяц у сузор'і Вадаліва.*

### Геамагнітныя ўзрушэнні




Абазначэнні:
- — невялікія геамагнітныя ўзрушэнні
- — слабая геамагнітная бура
- — малая геамагнітная бура
- — умераная геамагнітная бура



Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

## 22 КРАСАВІКА — Даты. Падзеі. Людзі

**У краіне**

**1725** год — гетман Міхал Казімір Радзівіл «Рыбанька» пабраўся шлюбам з Францішкай Уршуляй Вішнявецкай (з княжскага роду Карыбут-Вішнявецкіх, дачкой Януша Антонія, кашталяна кракаўскага, і Тэафілії з Ляшчынскіх). Атрымала бліскучую хатнюю адукацыю, ведала тры мовы, арыентавалася ў літаратурных навінках. Францішка Уршуля Радзівіл — першая ў Вялікім Княстве Літоўскім жанчына-драматург, стваральніца самабытнага тэатра ў нясвіжскай рэзідэнцыі Радзівілаў.

**1886** год — нарадзіўся (м. Ружаны Слонімскага павета) Іосіф Антонавіч Дудзінскі, актыўны ўдзельнік рэвалюцыйнага руху. У маі 1905-га маладзёжная ячэйка Ружанскай падпольнай рэвалюцыйнай арганізацыі, створаная Дудзінскім, напала на валасную ўправу ў мястэчку Лыскаве, захапіла грошы і дакументы. Многія ўдзельнікі гэтай акцыі неўзабаве былі арыштаваны жандармерыяй, аднак Іосіф здолеў схавацца ў Ружанскай пушчы, а затым з дапамогай баранавіцкіх чыгуначнікаў выехаў за межы Гродзенскай губерні і пасяліўся ў Маскве. У снежні 1905 года браў удзел у паўстанні на Чырвонай Прэсні. Пасля рэвалюцыі 1917-га забяспечваў ахову Крамля. 28 кастрычніка 1917 года быў забіты ў баі з юнкерамі. Пахаваны каля Нікольскай вежы Крамлёўскай сцяны.

**1910** год — нарадзіўся Віктар Мацвеевіч Волчак, заслужаны архітэктар Беларусі. З 1953 года галоўны архітэктар інстытута «Белдзяржпраект». Сярод работ: будынак Мінскага аблвыканкама, Дзяржаўнага літаратурнага музея Я. Купалы, помнікі М. Казею, ахвярам Масюкоўшчынскага лагера смерці. Адзін з аўтараў мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць — герой».

**У свеце**

**1724** год — нарадзіўся Імануіл Кант, нямецкі філосаф, заснавальнік нямецкай класічнай філасофіі.

**1870** год — нарадзіўся Уладзімір Ільіч Ульянаў (Ленін), расійскі камуністычны тэарэтык, арганізатар і кіраўнік Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года ў Расіі, першы Старшыня Савета Народных Камісараў СССР.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета надрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 12 322. Індэкс 63850. Зак. № 791.

Нумар падпісаны ў 19.30 21 красавіка 2025 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12